Przesyłka opłacona ryczałtem.

№ 9 (63) Чацьвер, 26-га Лютага 1925 г. м. Вільня. Год II.

ГРАМАДЗКІ ГОЛАС

Выходзіць тры разы ў тыдзень. Цана нумару 15 грошай.

Падпісная цана на 1 месяц 1 злоты 80 гр. За граніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno, ul. Niemiecka, 1 „Hotel Sokołowskiego" pokój № 26. Рэдакцыя адчынена ад 10—2 гадз. Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. удзень, апрача сьвятаў.

Цана абвестак на 1 стар. — 15 гр. за радок пэтыту: у тэксьце — 10 гр. на апош. стар.— 5 гр.

Патрэбнасьць падатковае сыстэмы.

Справа ўпарадкаваньня падатковага цяжару дасюль стаіць востра і павінна быць прыведзена ўладамі ў такую сыстэму, каб цяжар гэты лажыўся на кожнага грамадзяніна прапарцыянальна яго плацежнай сілы.

Кожнаму зразумела, што ніякая нармальная дзяржава ў сьвеце ня можа істнаваць без падаткаў, але ў залежнасьці ад дэмакратычнасьці дзяржаўнага ладу той ці іншы ўрад данае дзяржавы трымаецца пэўнае меркі, каго і як абкладаць падаткамі.

Ніхто ня можа запярэчыць, што дзяржаўны лад цяпер у Польшчы саўсім іншы, як у бышай царскай Расеі, дзе заможныя клясы насяленьня адбывалі куды меншую, прапарцыянальна іх эканамічнай сіле, падатковую павіннасьць, чымся насяленьне незаможнае.

У Польшчы кожны павінен плаціць падаткі ў залежнасьці ад таго, што ён мае: падатак заможнага грамадзяніна мусіць быць шмат вышэйшым, чымся падатак бедака.

Аднак-жа, ваенная руйнацыя нарабіла гэтулькі мутаў у гаспадарцы, што вельмі трудна разабрацца, часамі, хто з двух суседаў заможнейшы? У сялянскай гаспадарцы гэта выясьніць хіба што найтрудней, але нельга сказаць, каб выясьніць было немагчыма.

Калі падаўнейшаму абкладаць сялян у залежнасьці ад ліку дзесяцін зямлі, якою кожны ўладае (як гэта было ў расейскія часы), дык тут на кожным кроку будуць паважныя памылкі. Што-ж з таго што той ці іншы беларускі гаспадар, пабываўшы ў выгнаньні дзенібудзь аж у Сярэдняй Азіі, вярнуўшыся нядаўна з бальшавіцкага раю, лічыцца ўласьнікам навет аднаго ці двох дзесяткоў дзесяцін зямлі, пазараставшае дзірваном, а то і проста бярэзьнікам! Трэба падрахаваць, што ён мае за даход з кожнае дзесяціны, ці йначай кажучы, якую ён мае плацежную сілу?

І вось такая згалелая катэгорыя беларускага сялянства, давездзеная неўмалімымі гістарычнымі падзеямі да торбы, павінна, ў сілу справядлівасьці, моцна адрозьнівацца ад катэгорыі болей сільных гаспадароў, па той ці іншай прычыне, менш ад войнаў пацярпеўшых. Урадовая падмога тых, хто патрапіць пусьціць у рух сваю занядаўшую гаспадарку і быць у блізкай будучыні здольным саўсім да падатковых павіннасьцяў, хіба што не абміне пры адбудове зруйнованых вайною гаспадарак. А тымчасам неабходны для занядаўшых гаспадароў пэўныя падатковыя палёгкі ў абцяжваньні не па сіле платазнольнасьці пацярпеўшага нашага сялянства. Скарб можа сьмела націснуць свой падатковы прэс на тых, хто карыстаецца рэчамі роскашы, вядзе выгадны гандаль ці наагул мае й на цяперашнія часы той або іншы вялізарны даход.

Трудна тут усё вымераць, як у аптэцы на вагах, але пэўны рэгулятар мусіць быць заведзены, дзеля таго, каб кожны адчуваў падатковы цяжар роўна, паводлуг свае эканамічнае сілы.

Нарэшце, пры цяперашняй стойкасьці дзяржаўнае валюты на міжнародным рынку, павінна быць зроблена ўсё як уладамі, так і грамадзянствам, каб ня даць магчымасьці падрастаць дарагоўлі самых необходных рэчаў на рынку унутраным, бо дарагоўля ніколі не пазволіць выбрысьці з палажэньня, пры якім падатковы цяжар вельмі востра адчуваецца.

Зьбіраньне падаткаў вымагае сыстэматызацыі ў тым духу, каб загадзя кожны ведаў час платы, каб тэрмінаў платы было якнайменш і каб яны па магчымасьці былі датарноўваны да тых пораў году, калі сялянству лягчэй зьбіцца на сякі-такі грош.

Шырокі падзел падатковых павіннасьцяў на розныя галіны пры вялікім ліку тэрмінаў платы блага ўплывае на псыхіку селяніна і часта-густа шмат адбірае ў яго лішняга часу.

Наш беларускі селянін нячувана пацярпеў ад вайны і мае чалавечае сваё права на ўвагу з боку гаспадарства пры адбываньні сваіх падатковых павіннасьцяў, на тое, каб сыстэма падатковай справядлівасьці запанавала якнайхутчэй.

З цыркуляру Міністра Унутраных Справаў аб аплаце пасьведчаньня ўласнаручных подпісаў.

19-га гэтага лютага Міністар Унутраных Справаў разаслаў ваяводзкім уладам у Берасьці, Наваградку, Беластоку, Вільні, Львове, Тарнопалі, Луцку і Станіслававе цыркуляр, які ў скарочаньні гаворыць:

„Да ведама Мін. Унутр. Спр. дайшло, што валасныя установы, пакліканыя да сьцьвярджэньня ўласнаручнасьці подпісаў па дэкларацыях, зьмяшчаючых жаданьні зьмены навучаньня ў публічных пачатковых школах, накладаюць аплаты ад 1 да 2 злот. за кожны сьцьверджаны подпіс, а ў шмат якіх выпадках саўсім адмаўляюць у сьцьвярджэньні ўласнаручнасьці подпісаў.

У зьвязку з гэтым, Мін. Ун. Спр. зазначае, што камунальныя установы могуць браць аплаты за ўрадовыя пасьведчаньні, аднак-жа павінны гэта рабіць на аснове фармальных пастановаў, якія падлягаюць контролю наглядных уладаў.

Паколькі йдзе аб аплаты за пацьвярджэньне ўласнаручнасьці подпісаў, Мін. Унутр. Спр. заўважвае, што паводлуг Констытуцыйна загарантованай бясплатнасьці навучаньня, а таксама дзеля таго, што аплаты гэтыя зачапляюць убогае насяленьне, браць гэтых аплатаў ня трэба. А сьцьвярджэньне ўласнаручнасьці подпісаў трэба лічыць праўным абавязкам, які установы бязумоўна павінны спаўняць.

П.п. ваяводам даручаецца праязсьці расьсьледаваньні, ў якіх валасьцех бяруцца аплаты, ўняважніць магчымыя пастановы датычна гэтых аплатаў і выдаць адпаведныя загады".

Палітычны агляд.

Пытаньне аб захаваньні міру зьяўляецца галоўнай тэмай, якая ня сходзіць са шпальтаў усіх газэтаў і з вуснаў палітычных дзеячоў амаль што ня ўсіх дзяржаваў. Не праходзіць дзень, каб тая ці іншая ангельская або француская газэта не выступала са сваім проектам разрашэньня гэтага пытаньня. І няма гэткага здарэньня, якім не скарыстаўся-б француcкі прадстаўнік улады дзеля выражэньня свае пазыцыі ў гэтым пытаньні. Больш за ўсё гаворыцца аб узмацаваньні міру ў Парыжы, дзеля таго, што Францыя больш за ўсіх даўшая ахвяраў у часе мінулай вайны і дзеля гэтага адтрымаўшая найбольшую частку ваенная нямецкай контрыбуцыі, выклікае проці сябе найбольшы гнеў з боку Нямеччыны, якая выразна рыхтуецца да рэваншу.

Мінулая вайна даказала, што навет перамога не пакрывае матар'яльных ахвяраў перамоўцаў. Сучасная вайна ня гэткая, як бышыя 30—50 гадоў назад, як напр. расейска-японская вайна, аб якой жыхары Эўропэйскай Расеі ведалі толькі з газэт ды пісьмаў салдатаў з Манджурыі. І, ня гледзячы на няўдачу Манджурскай кампаніі, Расея праз 5—8 гадоў пасьля гэтага яшчэ ляпей узмацавалася фізычна і эканамічна. Фінансавае палажэньне Расеі перад сусьветнай вайной было амаль што найлепшае ў сьвеце. У Расеі было больш золата, чымся ў кожнай іншай дзяржаве. Папяровы рубель быў абясьпечаны золатам на 98%, пад той час як у Амэрыцы і Японіі гэтае абесьпячэньне не перавышала 70%. Зусім інакш цяпер. Сучасная вайна, як паказала дасьведчаньне 1914—18 гадоў захапляе ўсё жыцьцё краю. У ёй прыймае учасьце проста або пасрэдна ўсё насяленьне. У Расеі было пастаўлена пад зброю больш за 20 міл. людзей. У Нямеччыне ўсё мужчынскае насяленьне, якое магло насіць аружжа, было мобілізована і паслана на фронт, а фабрыкі, чугункі, дзяржаўныя установы і сельская гаспадарка былі ў руках жаночых. Гэткае-ж напруджаньне ўсіх сіл выявіла Францыя, Англія, Італія, Аўстра-Вэнгрыя, Турцыя і інш. дзяржавы. І ў працягу 4-х гадоў з гэткім напруджаньнем фізычных сіл і тэхнічнай веды працавала ўся Эўропа над зьнішчэньнем самой сябе і руйнацыяй эканамічнага жыцьця. Дзеля гэтага няма дзіва, што дасюль, пасьля 7-ёх гадоў ад канца вайны нельга залячыць на-

енных ранаў. Эканамічны крызыс, абхапіўшы пераможцаў і пераможаных, цягнецца далей і ўсё больш загастраецца. Як перамогшая Францыя, гэтак сама й пераможаная Нямеччына і Аўстрыя аднолькава адчуваюць рэзультаты вайны і навет пераможцы апынуліся ў горшых эканамічных варунках. Францыя мае шмат балей даўгоў за Нямеччыну, а ў Англіі больш беспрацоўных, чымся ў Нямеччыне. Дзеля гэтага зусім зразумела, чаму Францыя і некаторыя іншыя дзяржавы, ў тым ліку й Польшча, з усіх сіл стараюцца захаваць мір і не дапусьціць ізноў да новай вайны, якая, калі-б навет удачна для іх скончылася, ня дасьць нічога апрача вялізных чалавечых і матар'яльных ахвяраў. Трэба памятаць, што будучая вайна будзе яшчэ больш крывавай і руйнацкай. Будучая вайна будзе вясціся, галоўным чынам, з помачу розных атрутных газаў, якія будуць распасюджвацца аэроплянамі ня толькі на фронце, але і ў глыбі краю за фронтам. Цяпер усе стараюцца выдумаць якнайболей гатункаў розных газаў, якія будуць магчы нішчыць усялякае жыцьцё на зямлі. Некаторыя з гэтых газаў гэткія моцныя, што, як пішуць амэрыканскія газэты, колькі эскадраў з запасам бомбаў з гэтымі газамі могуць у працягу 2—3 гадзін зьнішчыць усё насяленьне Нью-Іорку. Есьць бомбы з гаручым матар'ялам, якія могуць рабіць падпалы ў гарадох і вёсках. А дзеля таго, што цяпер усе дзяржавы, галоўным чынам, стараюцца павялічыць свае паветраныя сілы, якія мераюцца тысячамі, а хутка будуць мерыцца й дзесяткамі тысячаў аэропланаў (Нямеччына навет у канцы мінулай вайны мела колькі дзесяткоў тысячаў паветраных апаратаў), дык у часе будучай вайны ўсе тэрыторыі дзяржаваў, якія будуць ваяваць, асабліва малых, як Чэхія, Літва, Латвія, Румынія і інш., будуць пад пагрозай руйнацкае сілы аэроплянаў, которыя бомбамі з атрутнымі газамі і гаручымі матар'ялямі могуць зьнішчыць усё насяленьне і ўсю жывёлу ў гарадох і вёсках. Будучая вайна пагражае гэткай страшэннай катастрофай, якой яшчэ дагэтуль сьвет ня бачыў і ня чуў. Вось дзеля таго ўсе, каму дорага яго існаваньне, павінны з усіх сіл імкнуцца, каб захаваць мір і не дапусьціць да новай вайны, якая аднолькава страшнай будзе для ўсіх. Найбольш шансаў на ўдачу, ведама, будзе мець тая дзяржава, якая будзе ляпей да яе падрыхтованай і ў якой вышэй паставлена прамысловасьць і тэхніка. І з гэтага боку таксама на першае места перад усімі эўропэйскімі дзяржавамі выступае Нямеччына, ў якой хімічны вытвар вышэйшы, як на ўсенькім сьвеце. Калі мінулая вайна была вайной тэхнікі, дык будучая вайна будзе толькі паветранай вайной і вайной хімічнага вытвару. Немцы з ваеннага боку заўсёды былі наперадзе ўсіх дзяржаваў. Дзякуючы ім, японцы аказаліся пераможцамі ў расейска-японскай вайне, навучыўшыся ўсялякай ваеннай тэхнікі ў Нямеччыне. І цяпер нямецкія вучоныя бязупынна працуюць над адкрыцьцем розных новых ваенных спосабаў нішчэньня праціўніка. А ўрад не шкадуе на гэта грошай.

Адзін з польскіх публіцыстых сабраў, на падставе нямецкіх крыніцаў, вельмі цікаўныя даныя аб тэхнічнай і навуковай падгатоўцы Нямеччыны да будучай вайны. Гэтыя даныя датычаць 1922—23 гадоў і значыцца ня зусім акуратны. Паводле гэтых даных, паветраны нямецкі флёт з 2386 апаратаў у 1920 г. павялічыўся да 4771 ў 1921 г., г. зн. на 100 проц., у адзін год. Калі згадзіцца, што з гэткай-жа хуткасьцю, калі навет ня з вялікшай, ён будзе далей павялічваца, дык у 1922 г. ён будзе складацца з 9½ тысячаў, у 1923 г. — 19 000 і г. д. З гэткай-жа інтэнсыўнасьцю падгатаўляецца й чалавечы матар'ял. А дзеля таго, што, паводле Вэрсальскага трактату, Нямеччына ня можа мець запраўднай арміі больш за 100.000 да 100.000 паліцыі, дык уся падгатоўка чалавечага складу робіцца таёмна, пад відам спорту. Найбольш увагі зьвернена на ваенную падгатоўку вучнёўскае моладзі. Студэнтаў не дапушчаюць да выпускнога экзамену, калі яны не пакажуць пасьведчаньня, што прайшлі ваенныя курсы. Дзеля таго, што будучая вайна — гэта вайна тэхнікі, машынаў і газаў, дык будзе вясціся, галоўным чынам, мэханікамі і хімікамі. І з гэтага боку цікаўны цыфры нямецкіх унівэрсытэтаў і палітэхнікаў. У 1913 г. ў нямецкіх унівэрсытэтах было 67 тысяч 709 студэнтаў, у 1923 г. — 102.969. У той час лік студэнтаў палітэхнікаў павялічыўся з 13.590 да 28 975. Хімікаў было ў 1923 г. 3.871. Лік студэнтаў, як відаць з гэтых цыфраў, павялічыўся на 50 проц., а лік хімікаў на 33 проц. На палітэхніках лік хімікаў з 3.206 да 9 823. З гэтага відаць, як сыстэматычна і інтэнсыўна немцы падгатаўляюцца да вайны і азбройваюцца тымі спосабамі, якія будуць мець рашучы ўплыў на рэзультаты будучай вайны. Выперадзіць іх з гэтага боку, ведама, немагчыма. Але ўся палітыка Польшчы, таксама як і інш. прыхільнікаў міру, павінна быць скірована ў тым напрамку, каб наагул не дапусьціць да новай вайны, якая можа быць страшэннай для ўсіх.

N.

ПАЛІТЫЧНАЯ ХРОНІКА.

У Польшчы.

▭ Як піша „Kurjer Polski" за 23. II., вядомая справа дыркуляру Міністэрства Унутраных Справаў датычна пасольскіх мітынгаў па **крэсах** мае закончыцца, накуль што, тым, што Урад уносіць у Сойм законапроект, якім будзе нармавацца справа сабраньняў, скліканых сябрамі законадаўчых органаў. Проект прадбачыць толькі паведамленьне адміністрацыйных уладаў аб маючым адбыцца мітынгу. Правіла гэтае датычыць усяе дзяржавы і ня робіць ніякага вынятку для крэсаў. Толькі рада міністраў зьяўляецца ўпаважненай для спыненьня на працяг трох месяцаў сыстэмы паведамленьня, паколькі мясцовыя варункі вымагаюць гэтага. Пасольскія мітынгі адбываюцца ў прысутнасьці паліцэйскіх вурадніка і могуць быць імі распушчаны. Увесь законапроект зьмяшчае ў сабе толькі чатыры артыкулы.

▭ 23 лютага вярнуўся ў Варшаву з кароткага 2-х дзеннага пабыту ў Кракаве віцэ-прэм'ер п. Тугут. Польская прэса падае вестку, што п. Тугут меў у Кракаве нараду з групаю пасла Станчыка па справе стварэньня украінскага унівэрсытэту.

▭ 20 лютага ў Варшаве падпісана польска-француская эміграцыйная конвэнцыя. З француская боку конвэнцыю падпісаў, прыехаўшы ў Варшаву, францускі міністар Годар, а з польскага боку міністар працы Сокаль.

▭ Соймавая камісія ахвы працы прыняла пасьля трэцяга чытаньня законапраект аб дамовай службе. Прынята пастанова, што ў нядзелі і дні ўрачыстых сьвятаў праца ня можа цягнуцца больш як 6 гадзін. Пасьля праслужэньня 1 году дамовая служба мае права на 8 дзенны одпуск, а пасьля 3-х гадовае службы ў аднаго й таго самага гаспадара—на 15 дзён одпуску.

▭ Сойнам прыняты ў трэцім чытаньні проект зьмены распараджэньня Прэзыдэнта Рэспублікі аб сьвяточных днях. Аднаўляюцца сьвяты — другія дні Каляд, Вялікадня, Сёмухі і Грамніцы (2 лютага).

За граніцай.

▭ У **Рызе (Латвія)** ў рэзультаце вобыску ў цэнтральным саюзе камуністычных сындыкатаў арыштована 89 чалавек, з якіх пад арыштам пакінена 10.

▭ У **Нямеччыне** захварэў запаленьнем сьляпое кішкі Прэзыдэнт Рэспублікі Эбэрт, вынесшы ўдачную апэрацыю. Выздараўленьня яго чакаюць цераз 3—4 тыдні.

▭ У **Англіі**, на запрос у ніжняй палаце па пытаньню аб раззбраеньні, Чэмбэрлэн заявіў, што ангельскі ўрад аб гэтым ня вёў ніякіх перагавораў ні з адней дзяржавай. Была толькі чыста інфармацыйная размова з б. паслом Злучаных Штатаў Кэлёгам наагул па пытаньню аб раззбраеньні.

▭ Адказваючы на запрос у парлямэнце, **ангельскі** міністар Чэмбэрлэн сказаў, што **Англія** ня вышле свайго амбасадара ў **Маскву** пры цяперашніх варунках.

З запісак княгіні Нарышкінай.

Шмат расейскіх эмігрантаў, граўшых тыя ці іншыя ролі ў віхры падзеяў апошніх гадоў высьвятляюць сваімі ўспамінамі цікавыя для гісторыі моманты. Да ліку такіх аўтараў трэба аднесьці і кн. Нарышкіну, бывшую статс-даму пры трох царох у расейскім імпэратарскім двары. Будучы вельмі ўжо старою Нарышкіна паехала разам з апошняю царыцаю Аляксандраю ў Табольск, дзе і прабывала ўвесь час ссылкі царскае сям'і. Часьць успамінаў Нарышкінай друкуецца цяпер у „Neue Freie Presse". Вестка аб вайне застала княгіню ў Крыме, адкуль яна пасьпешна выехала ў Пецербург. Блізу што адначасна туды вярнулася з-за граніцы й царыца-ўдава Марыя Фёдараўна, якую Нарышкіна сустрачала на вакзале ў Пецергофе.

— Марыя Фёдараўна, — ўспамінае княгіня, — не памятала сябе ад злосьці на немцаў і мы таксама, таму што вайна была, ведама-ж, справаю рук Вільгэльма. Ён 40 гадоў да яе рыхтаваўся і вось дачакаўся, як яму здавалася, выгаднага часу. Мне асабіста здаецца, што нашыя дыплёматы зрабілі вялікую памылку, заключыўшы саюз з Англіяй, тады як для Расеі выгадней было жыць у згодзе з немцамі, не разрываючы з Францыяй. Праўда, тады трэ' было-б зрабіць ахвяраю Сэрбію, а Расея гэткае ганьбы не магла ўзяць на сябе — нашто-ж тады мы ваявалі з туркамі?.. Але мне здаецца ўсё такі, што можна было-б, ня ўцягваючы Вільгэльма, даць Аўстрыі самой рахавацца з Сэрбіяй, ня робячы з гэтага эўропэйскага пытаньня і не даводзячы да сусьветнае вайны.

Двор пераехаў у Маскву і нейкі час заставаўся там... Маніфэст вял. князя Мікалая Мік-ча мне спадабаўся — падзел Польшчы заўсёды здаваўся мне несправядлівым, асабліва цяпер, калі саюзьнікі напісалі на сваім штандары пашану да нацыянальнасьці. Царыца Аляксандра Фёд-на і яе дочкі зрабілі ў Зімовым Палацы шпіталь і курсы сёстраў міласэрдзя; самі вучыліся і старанліва даглядалі раненых; хворыя іх страшэнна любілі. Хоць А. Ф. й бядавала ад няшчасьцяў з яе блізкімі на вайне, а ўсё-ж яна стала душою й целам расейкаю і хто папікае яе слабасьцю да яе роднага краю, той вельмі да яе несправядлівы... Яна выказвала вялікі талент да арганізацыі... і любасьць да сур'ёзнае працы, якую яна рабіла без рэклямы і якая была зусім невядомаю лёгкамысьнаму грамадзянству, судзіўшаму яе гэтак строга. Тут яна была саўсім сама сабою і гэта ўмацоўвае мяне ў перакананьні, што яе асьляпленьне Распуціным было проста асобнага роду хваробаю душы, вымагаўшай лекара. Я аднаго разу сказала гэта Боткіну. Ён сумна адказаў: «Саўсім згаджаюся з вамі і шкадую, што раней не зразумеў гэтага». Няўдачы йшлі за няўдачамі, а вялікі кн. Мік. Мік. ня траціў свае популярнасьці. Вінаваціла рэжым, непарадкі ў ваенным міністэрстве, тое, што ген Сухамлінаў быў пад башмаком у свае жонкі, цераз якую ў гэтае, вельмі важнае міністэрства траплялі людзі самае благое рэпутацыі і стваралі там нездаровую, болей як падазроную, атмосфэру. Само сабою пані Сухамлінава належала да катэгорыі пані Вырубавай і праз яе знайшла доступ да царыцы. У мяне з гэтымі людзьмі нічога супольнага ня было, і праз гэта я навет не спатыкалася з імі. Што датычыць в. кн. Мікалая, ён імпанаваў войску і войска было яму адданым, галоўным чынам, таму, што яно ведала, што ён аднолькава строгі як да вышэйшых, так і да найніжэйшых чыноў. Гэта рабіла яго падазроным. Разышлася дзейка, нібыто ён задумвае адсунуць цара і, цераз згавор, сам хоча налажыць карону. Гаварылі быццам у гэтым згаворы замешаны Арлоў, начальнік царскай канцэлярыі — чалавек спрабаванае вернасьці, стаяўшы вышэй за ўсяля-

У Мілане (Італія) пасьля сходу дэмакратычнага таварыства дайшло да барацьбы паміж фашыстымі і студэнтамі, пры гэтым старшыня таварыства граф Сфорца быў ударапы кулаком па галаве.

З Букарэшту (Румынія) паведамляюць аб зачыненьні тамашняга унівэрсытэту. З прычыны раскіданьня студэнтамі адозваў, заклікаўшых да забастоўкі, паліцыя й войска абсадзіла будынак унівэрсытэту. Дзеля таго, што некалькі слухачоў стараліся перашкодзіць лекцыям, дайшло да сапраўдных ваяўнічых паміж студэнтамі з аднаго боку і паліцыяй ды войскам — з другога. Падчас калатні цяжка ранены 3 студэнты, 20 слухачоў арыштована.

Газэты паведамляюць з Канстантынопалю аб вялікай конфэрэнцыі паміж Мустафой Кэмаль-пашою і Ізмэт-пашою. У зьвязку з грэка-турэцкім конфліктам ня выключаецца магчымасьць кабінэтнага крызысу ў Ангоры.

Паводлуг вестак з Масквы, 22 лютага ў зьвязку з 7-мі ўгодкамі істнаваньня чырвонае арміі адбыўся на Чырвоным Пляцы ваенны парад. 15.000 войска прадэфілявала перад стаяўшымі на ступенях маўзолею Леніна: ваенным камісарам Фрунзэ, Уншліхтам, Каменевым, Будзенным, Бубновым і прадстаўнікамі цэнтральнага выканаўчага камітэту С. С. Р. Р. Фрунзэ перад парадам меў прамову і, паміж іншым, сказаў, што ў цяперашні час узмацненьня напору „імпэрыялістычных дзяржаваў" на рабоча-сялянскую радавую дзяржаву, чырвоная армія павінна падрыхтавацца да новых перамогаў (!).

„Neue Freie Presse" паведамляе з Вашынгтону, што ў пачатку будучага тыдня прэзыдэнт Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў Кулідж, сэнатар Бора і міністар заграпічных справаў Кэлёг абгавораць з прадстаўнікамі сэнацкіх клюбаў варункі, на якіх Злучаныя Штаты маглі-б пачаць з бальшавікамі перагаворы аб прызнаньні СССР. Есьць весткі, што спачатку будуць перагаворы саўсім неофіцыяльныя.

У Прусіі ляндтаг большасьцю 225 галас. проці 219 адмовіў у даверы кабінэту Маркса, які пасьля галасаваньня заявіў ад імя ўраду аб адстаўцы. Стварэньне новага кабінэту мае быць даручана Марксу йзноў.

Беларусы!

Калі маеце дзяцей школьнага веку, дык памятайце, што да 31 сакавіка гэтага году вы павінны кожны ад сябе асобна падаць Павятоваму Школьнаму Інспэктару дэкларацыю аб жаданьні мець у вашым абводзе школу з беларускаю моваю, як выкладоваю!

УЗОР

дэкларацыі аб жаданьні роднае школы, якая павінна падавацца Школьнаму Павятоваму Інспэктару пасьля таго, як уласнаручны подпіс таго, хто падае дэкларацыю, будзе засьведчаны—ў волосьці, міравым судзьдзёю ці натарыюсам:

ДЭКЛЯРАЦЫЯ

Я ніжэй падпісаны (ая) .... (імя і прозьвішча) *грамадзянін (ка) Польскае Рэспублікі, беларускае нацыянальнасьці, жыхар (ка)* .... (назоў мясцовасьці) *волосьці,* .... (назоў волосьці) *павету* .... (назоў павету), *як бацька — маці — праўны апякун двіяцяці — дзяцей — у школьным веку*

1. .... (імя дзіцяці) 3. .... (імя дзіцяці)
2. .... (імя дзіцяці) 4. .... (імя дзіцяці)

на падставе артыкулу 3 Закону 31 ліпня 1924 г., што зьмяшчае некаторыя пастановы аб арганізацыі школьніцтва („Dz. Urz. R. P." № 79, poz. 766) жадаю ўвядзеньня ў істнуючую — маючую адкрыцца — публічную народную школу у .... (назоў мясцовасьці) *беларускае мовы, (як выкладовае).*

Дн. .... *192* ... *г.* .... (уласнаручны подпіс)

Да школьнага Інспэктара

у .... (назоў мясцовасьці)

УВАГА. У тэксьце дэкларацыі непатрэбныя словы зачыркнуць.

Агляд прэсы.

„Robotnik" піша аб прамысловым крызысе, ў Польшчы гэтак:

> Крызыс у прамысловасьці працягваецца і прыймае больш вострыя формы. Лік безработных безупынна расьце, а разам з гэтым расьце і лік непоўнаработных. Горная прамысловасьць пераходзіць з 5-цех дзён працы на 4, навет у некаторых шахтах на 3 дні працы. Гэтак сама і ў шмат якіх іншых галінах прамысловасьці. Побач з узрастаньнем безработцыя расьце й дарагоўля тых спажывецкіх тавараў, якія купляе рабочы. Голад і бяда пашыраюцца сярод безработных і навет сярод працоўных, выклікаюць хваробы і сьмерць у прамысловых цэнтрах, асабліва сярод дзяцей.

Далей, падаўшы рад цыфраў, якія надта ярка абрысоўваюць цяперашняе безгалоўе польскага рабочага, аўтор піша:

> Як можа рабочы, ня толькі з сям'ёй, але навет і адзінокі, жыць праз увесь месяц з гэткай платы? Гэтыя рабочыя заўсёды галадаюць разам са сваімі сем'ямі. Каб не памёрці з голаду, прадаюць усё з хатняе гаспадаркі, што мае яшчэ сякую-такую вартасьць. Прадаюць апошнія вопраткі, пасьцель, ложкі, ганзінькі, а часта навет апошняе крэсла і адзіны стол. Роспач і страх агартае, калі ўвайдзеш у хату безработнага і бачыш голыя сьцены, бярлог з саломы замест ложка і галодныя, паўнагія дзеці.

У канцы свайго артыкулу аўтор раіць гэткія спосабы, каб папраўляць ліха:

> Трэба павялічыць падмогі для безработных прынамсі на гэткі %, на які ўзрасла дарагоўля харчоў ад моманту ўвядзеньня падмогаў. Рабочым, якія працуюць колькі дзён у тыдні, трэба намагчы даплатай з грамадзкіх грошай, хаця-бы тым, хто мае вялікую сям'ю і адтрымоўвае малую плату. *Калі тых, ад каго валежыць палепшыць істнаваньне рабочых, не пераканаюць гаспадарча - грамадзкія довады, дык няхай яны памятаюць, што голад можна перапосіць толькі праз нейкі час, што ад галоднай сьмерці можна бараніцца, прадаючы маемасьць датуль, пакуль будзе што прадаваць. Калі дакучлівы голад будзе трываць шмат доўга, калі застануцца галодныя, заплаканыя дзеці ды чорная, безнадзейная роспач — безработны можа страціць над сабой уладу і схапіцца за самыя роспачныя спосабы абароны.* (Курсыў „Robotn."). Сэрца і розум, дбаласьць аб дзяржаўны інтэрас і інтэрас грамадзкае гаспадаркі павінны скіроўваць высілкі ўсяго грамадзянства на тое, каб папраўляць быт і ратаваць найшоўшуюся над сьмяротнай пагрозай работніцкую клясу ў Польшчы.

Бесканечнае пытаньне аб зямельнай рэформе ізноў разглядаецца ў Сойме. „Kur. Pol." па гэтаму поваду піша:

> Нейкі злы лёс зьдзекуецца над справай зямельнай рэформы ў Польшчы. Ніводнаму з дзяржаўных пытаньняў польскі парлямэнт не ахвяраваў гэтулькі часу і не даваў такога значэньня, як вось зямельнай рэформе, а аднак гэтая справа ў працягу 6-ёх гадоў не скранулася з месца.
>
> Мала таго, што наагул разрашэньне пытаньня аб раздрабленьні маёнткаў і перадачы зямлі безьзямельнаму сялянству ў апошнія ў пэрыяд незалежнасьці—пасоўваецца вальней, чымся ў даваенны час. Тады адбываўся нармальны працэс парцэляцыі, цяпер ён штучна ўстрыманы. Радыкальныя клічы абясьпечылі і ўзмацавалі, хаця гэта дзіўна, істнаваньне абшарніцкіх двароў...

На гэта „абясьпечаньне і ўзмацаваньне абшарніцкіх двароў", можна адказаць той-жа самай перасьцярогай, якую „Robotnik" друкуе курсывам, кажучы аб безработцы гарадзкое беднаты.

кія падазрэньні... Паводлуг рады Распуціна і сваёго даўняга жаданьня, цар сам стаў на чале арміі, а Мік. М-ча пасадзіў намесьнікам на Каўказе, паслаўшы туды й Арлова.

Царыца паклікала мяне да сябе й расказала мне ўсё гэта. Я не памятала сябе і не хацела верыць у магчымасьць здрады, але яна цьвярдзіла, што ў яе руках доказы. — Цяпер, — казала яна, — Расея супакоіцца і будзе шчасьліваю, ведаючы, што аб яе лёсе дбае цар. — Я сказала, што мне прыйшло да галавы: «Вялікага князя ў арміі вельмі любяць». Яна ўзлавалася, блізу што крыкнула: «А цара хіба не?» І патрэбавала, каб я была на ўрачыстым малебстве з прычыны гэтага рашэньня цара. У мяне сэрца балела: мне здавалася немагчымым кіраваць самаўладна гэткім краем, як наш, і адначасна камандаваць падчас вайны гэткаю вялізнаю арміяю. Гэта былі задачы не па плячы і гэнію. Толькі шатан мог надаць чалавеку гэткага самадуму...

З гэтага момэнту пачынаецца актыўная роля царыцы. Дасюль яна мела ўплыў толькі на цара; цяпер яна пачала асабіста прымаць даклады міністраў і непасрэдна кіраваць ходам падзеяў. Перад выездам цара на фронт у адней з саляў палацу адбылася рада міністраў у поўным складзе пад яго кіраўніцтвам; пасьля канца паседжаньня царыца вышла, вядучы сынка за руку, акружаная дочкамі, ў бакавую салю, куды прыйшоў і цар разам з усімі міністрамі. Бачачы іх я адразу зразумела, што ўсе жаданьні і прапазыцыі міністраў ня былі задаволены. Асабліва пануры быў Крывашэін: пасьля ён мне казаў, што ўжо з гэтага момэнту ён ведаў, што ўсё страчана... Калі мы ехалі назад, царыца была ўся чырвоная ад гневу і з гэткай сілаю садрала рукавічку з рукі, што яна падралася; пры гэтым царыца сказала: «Гэтыя міністры ўсе трусы! Сярод іх, здаецца, што я—адзіны мужчына».

Пра заподозраньне царыцы Аляксандры Ф. ў здрадзе, ў тайных зносінах з Нямеччынай з мэтаю сэпаратнага міру, Нарышкіна расказвае: — «Мусі гэтая дзейка была прычынай таго, што цар адтрымаў пісьмо ад ангельскага караля, ў якім той пісаў, што трывожыцца за здароўе царыцы і запрашае яе адпачыць у іх у Сандрынгэме. Гэтае запрашэньне ў такі трывожны час усіх нас зьдзівіла; мы ня ведалі, што й думаць. Нашае зьдзіўленьне яшчэ мацней пабольшала, калі Джордж Б'юкэнэн патрэбаваў аўдыенцыі ў цара і рашуча заявіў яму, што яму добра вядома аб істнаваньні згавору з мэтаю сэпаратнага міру з Нямеччынай і што *нiцi гэтага згавору вядуць да імпэратрыцы.* Цар са злосьцю запярэчыў гэтай плётцы, а калі пасол (Англіі) ў размове сказаў, што царыцу ўсе ненавідзяць, дык цар пачаў запэўняць што ў арміі царыцу абажаюць... І паказаў купу удзячных пісьмаў і тэлеграмаў ад раненых салдатаў і афіцэраў, якіх яна даглядала...

Мы тады ўсе загневаліся на паступак Б'юкэнэна, але пасьля я даведалася, што ён дзеяў на аснове даносаў ангельскае паліцыі і што *зярнё праўды у гэтым бязумоуна было.* Быў арганізованы шырокі згавор з мэтай сэпаратнага міру пры пасрэдніцтве Распуціна, які ўжо ўвайшоў у зносіны з Леніным і з бальшавікамі. (!) Вайна ўсё роўна ісьці далей не магла, дзеля таго, што салдаты насьмерць змагліся і ў акопах браталіся з немцамі. Усе ведалі, што цар ні ў якім выпадку ня дасьць згоды на здраду саюзьнікаў—праз гэта да яго не адважыліся-б і зьвярнуцца з гэткаю прапазыцыяй. І вось паўстаў плян — прымусіць яго зрачыся пасаду на карысьць малога Аляксея, а рэгэнтшаю назначыць царыцу. Падрыхтоўваючы грунт, Гучкоў (?) аб'ехаў усіх камандзераў арміяй і ўжыў усё свае мастацтва пераконаваць, каб прыцягнуць іх на свой бок. Усе камандзеры абяцалі яму сваю падмогу, і гэта вытлумачвае неасяжную для мяне раней сугалоснасьць у адказах, якія былі даны цару на яго запрос аб адрачэньні...

Сьвядома ці несьвядома цэнтрам усім ін-

Жыхары Навагрaдчыны!

Памятайце, што калі хочаце каб у вас у будучым вучэбным годзе была ўрадовая беларуская школа і вашыя дзеткі вучыліся ў роднай мове, кожны з вас да 31-га сакавіка с. г. павінен зласьць паветоваму інспэктару асьветы асобную пасьведчаную дэклярацыю.

За ўсімі справамі, а таксама і за бланкамі дэклярацый, належыць зьвяртацца да Ураду Таварыства Беларускае Школы ў Навагрaдку — Навагрaдак, Карэліцкая вул., 24.

Старшыня П. СЬВІРЫД.

Навіны ў тры радкі.

— У СССР, пакуль што, ў абегу знаходзіцца 89 мільёнаў сярэбраных рублёў, якія складаюць 11 процантаў ўсяго грашовага абароту.

— Паводлуг перапісі, зробленае на мінулым тыдні ў Рызе (Латвія) лічыцца 327.176 жыхароў, апрача гарнізону. У 1920 г. было толькі 181.000.

— Мэтэоролёгічная станцыя ў Рызе занатавала прыбліжэньне вялізарнае хвалі холаду да паўночнае і сярэдняе Эўропы.

— У Гданску выпаў вялікі сьнег.

— 23-га лютага аэропляп польскае паветранае лініі Аэролёйд, ляцеўшы ў Гданск, з прычыны сільнага віхру мусіў непрадбачана спусьціцца. Апарат крыху пашкоджаны, адзін пасажыр прыкусіў сабе язык. Лятуны засталіся цэлымі.

— На партугальскі карабель „Dogola“ напалі кітайскія карсары. Падчас бою забіта з абодвух бакоў 39 чал. Апрача таго 40 чал. затанула.

— Петраградзкая „Правда“ піша, што бальтыцкі радавы флёт 23 лютага пачынае марскія манэўры.

— У Малой Азіі, з прычыны пашырэньня нячуванага бандытызму, ангельскі ўрад замерваецца ўвясьці стан аблогі.

У Сэвастопалі цяплыня ўдзень даходзіць да 20 градусаў. У Архангельску йдуць дажджы.

— У Мэксыцы раптоўна загарэўся адзін з найвышэйшых у сьвеце вулканаў. Ваколічнае насяленьне пусьцілася ўцякаць, прасьледаванае ручаямі лявы і густым дажджом попелу.

— Італьянскі кароль зацьвярдзіў закон аб выбарнай рэформе.

— Закладчык Ку-Клюс-Кляну Вільям Сімонс памёр у Нью-Іорку ў рэзультаце здарэньня з самаходам.

— 24. II памёр павадыр швэдзкіх рабочых, былы прэм'ер, Брантінг.

— У мэдыне (Італія) згарэла часьць будынку суда разам з судовымі дакумэнтамі.

У С.С.Р.Р.

Забойствы камуністых.

У Смаленскай губэрні ў вёсцы Прудкі забіты камсамолец (сябар саюзу камуністычнае моладзі). У вёсцы Каршугі, меленкоўскага павету, застрэлены камуністы, зьбіральнік падаткаў Крошкін.

У **Менску** закончыўся працэс проці гэтак званых „кулакоў“, абвінавачваных у замаху на забойства селькора (сельскага корэспондэнта) Лапіцкага ў в. Жэркаўкі.

У Харкаве адбыўся суд над забойцамі селькора Маліноўскага. У Адэсе адбыўся прыгавар па справе Рудзіна, абвінавачванага ў забойстве сэкрэтара рэдакцыі „Одесских Известий“.

Палёгкі „*благонадежным*“ быўшым афіцаром.

Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам і радаю народных камісараў СССР выданы дэкрэт аб звароце праваў некаторым катэгорыям быўшых царскіх і белагвардзейскіх афіцароў і ваенных ураднікаў, якія дасюль, хоць і служылі ў чырвонай арміі, але не карысталіся даверыем радавага ўраду і былі ўвесь час пад асобным кантролем. Дэкрэт датычыць толькі „заслужаных“ перад чырвонаю арміяй і радавым урадам афіцароў.

Прыгавар сьмерці.

У Менску найвышэйшым судом Беларускае Рэспублікі разглядалася некалькі дзён назад справа нейкага Дудзькі-Грыгор'ева, абвінавачанага ў шпіёнстве на карысьць Польшчы. Найцяжэйшыя для абвінавачанага паказаньні зрабіў на судзе сьведка абвінавачаньня Грач — сябар арганізацыі „Зялёны Дуб“, таксама арыштованы бальшавіцкімі ўладамі за дзейнасьць на карысьць Польшчы. Грач паказаў, што Грыгор'еў быў сябром „Зялёнага Дуба“, афіцэрам арміі Балаховіча, а таксама прабываў у СССР па даручэньню паручніка Польскіх Войск Бутвілы. Абвінавачаны не прызнаўся да віны. Суд, разглядзеўшы справу, засудзіў Дудзьку-Грыгор'ева на кару сьмерці.

Лік камуністых.

Паводлуг афіцыяльных даных на 1 сьнежня леташняга году ўва ўсім Саюзе Соцыялістычных Радавых Рэспублік, апрача Ташкенту, налічвалася каля 700.000 камуністых, у тым ліку больш як 300.000 кандыдатаў, навічкоў і 73 т. жанчын. З агульнага ліку на Маскоўшчыну (РСФСР) выпадае 357.000 камуністых, Украіну—98.000, Беларусь—каля 11.000 і на ўвесь Сыбір 49½ тыс.

Галадоўля.

У Сімбірску на парадзе губэрскае камісіі пасьледзтваў голаду дакладамі павятовых выканаўчых камітэтаў было устаноўлена, што на 1 лютага патрабуюць харчовае ўрадовае падмогі 186.000 сялян, якія саўсім ня маюць запасаў хлебных прадуктаў, папрадавалі буйную і дробную жывёлу і кормяцца сурогатамі. Насеньне для сяўбы ёсьць толькі ў 15 проц. заможнага сялянства ўва ўсёй губэрні. У Сімбірскім павеце зарэестравана 16 вёсак, насяленьне якіх хварэе апуханьнем і сьпячкаю ад пахудзеньня.

ТУТЭЙШАЯ ХРОНІКА.

= Агульны сход праваслаўных. У нядзелю 22-га лютага ў памешканьні Беларускага Віленскага Клюбу адбыўся агульны сход праваслаўных м. Вільні. Сход быў працягам гэткага-ж самага сабраньня праваслаўных, быўшага 1-га лютага, і разглядаў пытаньне аб сьвяткаваньні паводлуг старога стылю, пры чым выясьнілася, што архіепіскап Хвядос абяцаў адпраўляць божую службу ў бліжэйшыя сьвяты і паводлуг старога стылю. Паміж іншым, сход пастанавіў паднясьці архіепіскапу абраз ад імя праваслаўных, а таксама паднясьці пратаярэю Гапановічу залаты крыж, папрасіўшы на гэта багаслаўленьня архіеп. Хвядоса.

= Лік чужаземцаў. Як піша „Słowo“, лік чужаземцаў на абшары Віленскага Камісарыяту Ураду раўняецца 2.000; ў гэтым ліку знаходзяцца пераважна жыды і расейцы, якія саўсім ня маюць кваліфікацыі на адтрыманьне правоў польскага грамадзянства.

= Дзікасьць домаўласьніка. 22 лютага домаўласьнік Н. В. ударыў нагою ў калена сваю кватарантку Нарвойш (вул. Покуй № 50), якой пераламаў нагу. Пацярпеўшая адаслана ў жыдоўскі шпіталь.

= Суд. 24 лютага ў Віленскім Апэляцыйным Судзе разьбіралася справа Шыі Вінаграда, які Акружным Судом 11 красавіка 1924 г. быў засуджаны на 8 гадоў цяжкага вастрогу. Вінаград у 1921 г. нелегальна перайшоў польска-савецкую граніцу і быў затрыманы на ст. Новай-Вялейцы, дзе яго пазналі, як сябра ваенна-рэвалюцыйнага трыбуналу ў Менску. Вінаград абвінавачваўся па 108 арт. Карн. Код. Апэляцыйны суд прыгавар Акружнога Суда зацьвярдзіў. Бараніў Вінаграда прысяжны адвакат Сьмільг.

= Папраўка. Нас просяць паправіць няточна паданую ў 8-м нумары нашае газэты вестку аб падмозе Беларускай Клецкай Гімназіі. Падмога была выдана Гімназіі Віленскім Беларускім Клюбам, а не Беларускім Грамадзянскім Сабраньнем, ад якога Гімназія ў Клецку ніякіх грашавых падмогаў не адтрымлівала.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Пане Рэдактар!

У сувязі з адозвай Цэнтральнае Беларускае Школьнае Рады, выдрукаванай у № 6 „Беларускай Долі“ ад 23 студня г.г, Урад Таварыства Беларускае Школы ў Навагрaдку мае гонар прасіць памясьціць у „Грамадзкім Голасе“ ніжай паданае:

Таварыства Беларускае Школы ў Навагрaдку вядзе працу помачы беларускай асьветнай справе ўжо болей трох гадоў. Сконструованае грамадзкім парадкам, на чале з выбарным Урадам, яно зьяўляецца прадстаўніком думак грамадзянства ў асьветных справах Навагрaдчыны. Ставячы перад сабою гэтыя мэты, Таварыства зьяўляецца абсолютна апалітычным, і дзеля гэтага з непамерным зьдзіўленьнем зазначае факт абмінуцьця яго праз Цэнтральную Беларускую Школьную Раду ў вышэй пададзенай адозьве і заяўляе проціў такога трактаваньня роўназначнай па сваёй працы беларускае арганізацыі свой протэст, падкрэсьліваючы, што і далей будзе служыць справе асьветы Навагрaдчыны, заклікаючы якнайболей грамадзян да гэтае працы.

Старшыня *П. Сьвірыд.*

Сэкрэтар *І. Біруковіч.*

Навагрaдак
11. II. 1925.

Паштовая скрынка.

Новік Піліп, *Акулік* Мікола, *Багрэц* Тэрэнці, *Макаль* Базыль, — ад усіх грошы адтрыманы.

Рэдакцыя „*Украінський Голос*“, — №№ 3 і 5 дасылаем.

Каравай Язэп, *Сасноўскі* Пётра, — на просьбу ў пісьме газэта высылаецца.

Лапка Мікола, *Баравы* Мікола, *Каваленак* Казімір, *Высоцкі* Янка, *Грыневіч* І., — ўсім на просьбу ў пісьме газэта высылаецца.

Тымашэвіч Пётра, — пісьмо адтр., газэта высыл.

Смалонская М.—лік высыланых Вам №№ газэт павялічым. Календар высланы толькі тым падпісчыкам, каторыя прыслалі грошы за другія паўгодкі 1924 г.

Газэту прачытай і перадай суседу!

Той, хто умее чытаць, ніколі не паланюйся прачытаць нятісьменнаму!

трыгаў была Аня Вырубова. Каля яе ўсе круціліся, дзеля таго што яна была ў ласцы ў царыцы. Ад двара аддалялі ўсіх людзей, належаўшых да праціўнае партыі і адданых цару. Зьнік Арлоў і Трубецкой, былі ўхілены ўплывовыя вялікія князі. На адным вялікім абедзе я аказалася суседкаю вял. князя Сяргея Міх. І спыталася ў яго: «Вы, здаецца, ня вельмі часта тут бываеце?» — Саўсім ня бываю, — адказаў ён. «Гэта мяне зьдзіўляе».—І мяне таксама. — «То-ж вы расьлі разам з царом і займаеце гэткі высокі пост (начальніка артылерыі). Няўжо-ж вы ніколі не гаворыце з царом аб вашай працы, не паведамляеце яго аб вашых плянах?»—Ніколі,— быў адказ: — Я раблю даклад ваеннаму міністру дый толькі...

Пра забойства Распуціна „Нарышкіна піша: „Цар быў вельмі адзінокі, таму што стары граф Фрэдэрыкс вельмі пастарэў. Зяць яго запэўняў і навет пайшоў у заклад, што мір будзе зроблены не пазьней пачатку траўня. А. Распуцін рашуча цьвярдзіў, што мір будзе падпісаны 28 сьнежня; казаў гэта й Фэліксу Юсупаву, і каб ўратаваць Расею было пастаноўлена забіць Распуціна раней, 16-га. Калі-б плян Распуціна ўдаўся, думаю, што згаварыўшыяся ня спыніліся-б ні перад чым у справе ўхіленьня цара. Уплыў гнюснага інтрыгана на царыцу быў гэтак вялікі, што з яго падмогай яе спадзяваліся ўпэўніць у чым хацелі; тады намі кіраваў Распуцін ды Пратапопаў... Мусі дзеля гэтага вял. княгіня Елізавета Фёд. (сястра Аляксандры Фед.) і падбухторвала так да гэтага забойства (Распуціна) свайго пляменьніка Дзьмітра Паўлавіча, хаця яно павінна было вельмі брыдзець яе душы, аддадай любасьці да Бога і людзей. Для яе гэта было ня пустою пагрозаю, а немінучаю, напаўзаўшаю небясьпекаю. Царыца патрабавала з архіваў міністэрства ўсе арыгінальныя тэлеграмы, і яны даказвалі моральнае учасьце вял. княгіні ў гэтым жахоўным забойстве. Падробнасьці вядомы, я прыводзіць іх ня буду».

КАНЕЦ.

Рэдактар-Выдавец Язэп Салавей

Друкарня „Lux“, вул. Жэлігоўская, 1. Тэлеф № 203.